**Квач, А.** «Чорны цюльпан», або Недагарэўшыя зоркі… / А. Квач // Веснік Глыбоччыны. — 2005. — 23 сак. — С. 2.

**«Чорны цюльпан», або Недагарэўшыя зоркі…**

У гэтым годзе споўнілася 16 гадоў, як савецкія войскі былі выведзены з Афганістана. У сувязі з гэтай датай у нашай школе адбылася сустрэча з воінам-інтэрнацыяналістам Уладзімірам Антонавічам Пашкевічам. Аповяд гэтага чалавека ўсхваляваў мяне, словы яго запалі ў душу. Бачна было, з якім болем расказваў ён аб тых падзеях.

Ён, як і ўсе юнакі, трапіў у Афган, адбываючы тэрміновую службу. Пытанне ў 18-гадовага хлопца, ісці ў Афганістан ці не, не паўставала. Гэта было бясспрэчным, гэта было ганаровым абавязкам, нават нейкай рамантыкай. І ў першых эшалонах Уладзімір апынуўся там. Сказаць, што было дяжка, – нічога не сказаць. Было страшна цяжка: горы, гарачыня, чужыя зямля і народ, які ненавідзеў «шураві» і помсціў на кожным кроку. Жылі ў палатках, прадукты харчавання ад гарачыні хутка псаваліся і, як вынік, – тыф, дызентэрыя. Вось у якіх умовах трэба было жыць і ваяваць...

Адслужыўшы, Валодзя вярнуўся дадому. Жыццё паступова пачало наладжвацца. З'явілася сям'я. Шмат хлопцаў, якія прайшлі дарогамі Афгана, застаюцца працаваць у сілавых структурах. Вось і Уладзімір Анатольевіч узначальвае зараз міжраённае рэгістрацыйна-экзаменацыйнае аддзяленне ДАІ. У першыя гады пасля службы вайна ў Афгане снілася. Аб тых далёкіх падзеях напамінае медаль «За баявыя заслугі», успамінаецца пражытае, не забываюцца імёны сяброў, якія засталіся там навечна.

16 гадоў прайшло з таго часу. Мы, юнае пакаленне, пра тыя далёкія падзеі даведваемся з кніг і расказаў саміх удзельнікаў. Вось і Вам, паважаны Уладзімір Антонавіч ад імя вучняў і настаўнікаў Галубіцкай школы хочацца сказаць вялікі дзякуй за тое, што знайшлі час наведацца да нас і расказаць пра сваё суровае ваеннае юнацтва. Моцнага Вам здароўя, поспехаў у працы, сямейнага дабрабыту і простага чалавечага шчасця!

**Алеся Квач**,
вучаніца 9-га класа Галубіцкай базавай школы